УДК 82.091

# СІМВАЛІЧНЫЯ СРОДКІ ПЕРАДАЧЫ ЭЛЕМЕНТАЎ ФІЛАСОФІІ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМУ (на прыкладзе супастаўлення твораў В. Быкава «Аблава», А. Камю «Міф пра Сізіфа», М. Хайдэгера «Праселак»)

*Т.Р. БАГАРАДАВА*

*Робіцца спроба супастаўлення і аналізу шэрагу элементаў філасофіі экзістэнцыялізму, разглядаецца сутнасць тэрміна «экзістэнцыя», праектуюцца асноўныя палажэнні і ідэі экзістэнцыялізму на беларускую літаратуру. На прыкладзе вобразаў галоўных герояў робіцца аналіз паводзінаў чалавека ў памежнай сітуацыі, разглядаецца сутнасць тэрміна «сапраўднае існаванне» і паказваецца яго своеасаблівае ўспрыманне галоўнымі героямі твораў. Закранаецца пытанне функцыянальных аспектаў моўных сродкаў пры стварэнні адпаведных мастацкіх малюнкаў і вобразаў, супастаўляюцца пэўныя элементы сімволікі, паказваецца роля экзістэнцыялізму як аднаго з вядучых напрамкаў развіцця філасофіі XX стагоддзя.*

Сусветная філасофія яшчэ з часоў антычнасці спрабавала даць адказы на пытанні накшталт: што есць быццё, і ў чым заключаецца існаванне? Што такое свет (чалавечы свет), і дзе месца чалавека ў гэтым свеце? У чым сэнс жыцця, і дзе шукаць выйсце?

Сярод уплывовых філасофскіх вучэнняў XX стагоддзя, што займаліся разглядам і аналізам дадзеных праблем, значнае месца належыць філасофіі экзістэнцыялізму, росквіт якой прыпадае на 50 – 60-я гады. Прыгадаем, што праблематыка экзістэнцыяльнай філасофіі выйшла з Германіі, што Францыя яе засвоіла і ўзбагаціла, і што Германія пасля другой сусветнай вайны атрымала яе назад у новай узбагачонай і паглыбленай форме.

Сама назва дадзенага філасофскага напрамку бярэ пачатак ад лацінскага слова existentia, што ў літаральным перакладзе азначае – існаванне. Што есць існаванне? Гэта адно з ключавых пытанняў экзістэнцыяльнай філасофіі. Гэтая праблема па-рознаму трактавалася філосафамі дадзенага напрамку. Так, С. К'еркегар уяўляў сабе чалавечае існаванне як рух, узыходжанне ад эстэтычнага спосаба быцця праз этычны да рэлігійнага. Менавіта на гэтым шляху, паводле слоў С. К'еркегара, чалавек знаходзіць сябе і разумее сябе праз акты любові і веры ў Бога; толькі даведаўшыся, якога дзеяння хоча ад нас Бог, мы далучаемся да сапраўднай экзістэнцыі. Аналагічныя ідэі ў другой палове XIX стагоддзя развіваліся Ф. Ніцшэ. На яго інтэлектуальнае станаўленне сур'ёзны ўплыў аказалі А. Шапенгаўэр, Э. Гартман, Ф. Лангэ, Е. Дзюрынг. Так, згодна А. Шапенгаўэру, у жыцця няма ніякай мэты, яно ўяўляе сабой бяздумны рух, а значэннем валодае толькі адна бессвядомая касмічная воля. Менавіта воля, паводле А. Шапенгаўэра, з'яўляецца асновай свету і жыцця. А. Шапенгаўэр пісаў: «Уласна існаванне індывіду дадзена толькі ў цяперашнім, якое нястрымна цячэ ў мінулае, у пераходзе да смерці, у пастаянным паміранні» [1, с. 41].

Для Г. Гегеля, напрыклад, ісцiннымі з'яўляюцца ўсе мінулыя філасофскія сістэмы як моманты ісціны, што праяўляецца ў гісторыі філасофіі. Насуперак С. К'еркегару, які казаў: «Самагубства – адмоўная форма бясконцай свабоды. Той шчаслівы, хто знойдзе станоўчую» [2, с. 13], А. Камю, напрыклад, у сваім творы «Міф пра Сізіфа» шукае такую «станоўчую форму» быцця ў свеце, у якім рэлігійная надзея памерла б. А. Камю ставіць наступнае пытанне: як жыць без вышэйшага сэнсу і без боскай ласкі? У сваю чаргу, К. Ясперс ведае рэчаіснасць, якая трымае для нас напагатове поўнае крушэнне, але пры гэтым піша: «У дзеянні і першапачатковай свабодзе, у кожным імгненні абсалютнай свядомасці, у кожным акце кахання прарываецца ніколі не забываемая ў іх часовасць, якая адчыняе шлях да вечнасці дзякуючы рашэнню і выбару» [1, с. 44].

Найбольш поўна, на нашу думку, адлюстраваў пошукі чалавекам сэнсу свайго існавання знакаміты нямецкі філосаф Марцін Хайдэгер (1889 – 1976). Па словах даследчыка-германіста, культуролага А. Міхайлава «...Яшчэ філосаф позняй антычнасці Прокл пісаў пра тры ступені, па якіх праходзіць душа чалавека: знаходжанне, зыходжанне, вяртанне (манэ, праадас, эпістрафэ)» [3, с. 181]. Чалавек зыходзіць з роднага дому (вымушана ці добраахвотна), пакідаючы свае вытокі, карані, родную зямлю; пасля ен абавязкова павінен вярнуцца назад. Паводле А. Міхайлава: «Вяртанне – ...вянец існавання, яно таксама валадарыць над чалавекам як моц цэлага і мэты, як набытак. Чалавечае існаванне ў некаторым сэнсе і есць менавіта зыход, выхожданне з сябе, літаральна – «ис-ступление», лацінскае слова «экзистенция» (дакладней «экс-систенция»); такім чынам, існаванне і азначае «стаянне па-за»» [3, с. 5]. Чалавек вяртаецца дадому, несучы з сабой нешта новае, зведанае ім, прапушчанае праз яго розум і душу. Сама дарога ўвасабляе ў сабе ўсе існае і ўбірае ў сябе ўсю сутнасць чалавека, які знаходзіўся па-за родным краем, роднай зямлей, нават па-за сабой.

Паводле філасофіі М. Хайдэггера, быцце ўяўляе сабой тры этапы: СВЕТ-БЫЦЦЕ Ў СВЕЦЕ-БЫЦЦЕ. Свет – гэта арэна паўсядзеннага, несапраўднага існавання. Быцце – гэта незямное існаванне (паводле М. Хайдэггера «нішто»). Быцце ў свеце – гэта экзістэнцыя, якая ўяўляе сабой сапраўднае, адзінокае існаванне, што даступна нямногім людзям. Экзістэнцыя выражае адзінасць, унікальнасць кожнага чалавека і яго лёсу і ўказвае на магчымасці чалавека. Яна з'яўляецца адлюстраваннем менавіта схаваных мажлівасцяў, прамежкавым звяном дадзенага ланцуга, які атрымаў назву анталагічнай трыяды.

Калі спраектаваць асноўныя палажэнні і ідэі экзістэнцыялізму на беларускую літаратуру, то можна правесці пэўныя паралелі і знайсці парасткі тагачаснай філасофіі і ў яе творах.

Звернемся да творчасці знакамітага празаіка, майстра беларускага слова, класіка беларускай літаратуры В. Быкава. Многія даследчыкі творчасці гэтага аўтара вылучаюць у ёй пэўныя агульныя рысы. Прынамсі, для твораў В. Быкава характэрна наяўнасць філасофскіх і маральных праблем накшталт:

- увага да крызіснай (памежнай) сітуацыі;
- трагічнасць развязкі;
- праблема маральнага выбару герояў.

Але, на наш погляд, «высокія матывы» ў большасці сваей усе ж не назіраюцца ў творчасці В. Быкава. Рэальнае жыцце з хібамі, няўдачамі, пакутамі і яго сэнс, роля чалавека ў гэтым жыцці, якая часта з'яўляецца лёсавырашальнай для іншых людзей, мікрасвет «маленькага» чалавека – вось асноўныя пытанні, адказ на якія імкнецца даць аўтар на старонках сваіх аповесцяў і апавяданняў. Чалавек у творах В. Быкава часта дзейнічае сам па сабе, адасоблена, быццам адарвана, але, на нашу думку, гэтае адмежаванне толькі знешняе. Літаратурны герой В. Быкава (як станоўчы, так і адмоўны) заўседы валодае пэўным месцам у гэтым свеце, нібы нейкай своеасаблівай нішай, якую павінен займаць кожны чалавек, без якой жыцце ўсялякай асобы губляе свой сэнс.

Паводле М. Хайдэгера, само чалавечае існаванне вызначаецца як месца ў свеце (ад ням. dasein – існаванне) – гэта значыць «быцце тут», «тут-быцце». Не ў незямным існаванні (у нічым), не ў свеце, а менавіта тут і зараз. Па словах А. Міхайлава: «Чалавек – не выпадковы элемент цэлага, ен атрымлівае ў быцці свой сэнс, ен задлюстраваны з цэлым – у першую чаргу, са светам – акружэннем, але таксама з небам і зямлей» [3, с. 22]. Зыходзячы са сказанага, мы цалкам згодны і з наступнымі словамі А. Міхайлава: «Свет – гэта наяўнасць такой прасторы, у якой чалавек знаходзіць свае сапраўднае месца і свой сэнс» [3, с. 21]. Менавіта пошукі сэнсу жыцця (нават часам і несвядомыя), свайго месца ў ім характэрны для большасці герояў В. Быкава.

Не варта зараз пералічваць усе шматлікія творы пісьменніка, напісаныя на працягу цэлага жыцця; хацелася б спыніцца на вядомай аповесці «Аблава» (1988). Яна з'яўляецца яскравым прыкладам адлюстравання сусветных эстэтычных і гуманістычных тэорый, у прыватнасці тэорыі экзістэнцыялізму ў беларускай літаратуры.

У дадзенай аповесці закранаецца праблема існавання простага чалавека – селяніна Хведара Роўбы, лёс якога знявечаны ўсемагутнай машынай пад гучнай назвай «дзяржава» у гады сталінскіх рэпрэсій.

Паспрабуем правесці паралелі з творамі філасафаў-экзістэнцыялістаў, а менавіта, падрабязней спынімся на такіх творах, як «Праселак» М. Хайдэгера (напісаны праз некалькі гадоў пасля заканчэння другой сусветнай вайны і ўпершыню апублікаваны ў 1949 годзе) і «Міф пра Сізіфа» А. Камю (напісаны ў гады другой сусветнай вайны).

Аповесць В. Быкава «Аблава» уключае ў сябе пяць раздзелаў: «Чалавек на імшарыне», «Ноч і спакой», «Поўня», «Радасць зямлі», «Аблава».

Гэтыя пяць раздзелаў адлюстроўваюць гісторыю жыцця тыповага вясковага жыхара, якіх было мільены, і мільены якіх было знішчана сталінскай рэпрэсійнай машынай у гады калектывізацыі.

Чалавек на імшарыне... Увогуле, вобразна кажучы, тагачасная дзяржава ўяўляла сабой адну вялікую імшару, па якой небяспечна было хадзіць людзям, бо незнарок чалавек мог праваліцца так глыбока, што ніколі ўжо з той багны не змог бы выбрацца. Сапраўды, даследчыкі і вучоныя не могуць і зараз назваць дакладнай лічбы, якая б адлюстроўвала колькасць людзей, што загінулі на Поўначы краіны, у ссылках, у ГУЛАЗе, не пералічаныя ды і ніколі не будуць пералічаныя тыя пагоркі і безыменныя магілы, у якіх ляжаць нявінныя ахвяры.

Аблава... Гэта тыповы стан савецкай краіны, пачынаючы з 20-х гадоў XX стагоддзя. Аблава звычайна робіцца паляўнічымі з мэтай забіць, абясшкодзіць звера, ці воўчую зграю, ці асобнага ваўка. У дадзеным выпадку такім «ваўком» з'явіўся селянін Хведар Роўба, які трапіў у апалу, і на якога зрабілі аблаву. Лёс дадзенага селяніна – гэта тыповы лёс вялікай часткі сялянства, якая скончыла свае жыцце на далекай Поўначы. Большасць з гэтых людзей не ведала, за што пакутуе. Вось і Хведар Роўба пастаянна задае сабе гэтае пытанне, якое стала неад'емнай часткай яго свядомасці – завошта? У В. Быкава чытаем: «...Гэтае праклятае ЗАВОШТА пякельным вухналем сядзела ў яго галаве... Усе нешта казалі пра ўладу, класавую барацьбу і калектывізацыю. Але ніхто яму не растлумачыў так, каб адразу стала зразумела: завошта? У чым яго віна?...» [4, с. 332].

У адрозненне ад быкаўскага героя, Сізіфа А. Камю, па словах самога аўтара, «...трэба ўяўляць сабе шчаслівым» [2, с. 92]. У чым заключаецца гэтае шчасце? Менавіта ў тым, што, у адрозненне ад Хведара Роўбы з яго пастаянным «завошта?», селяніна, якому спачатку не належыць асабісты лёс, бо ен паламаны дзяржаўнай машынай, што знявечыла мільены падобных людскіх жыццяў, Сізіф, асуджаны паводле грэцкіх міфаў багамі на бясконцую, бязмэтную працу і вечныя пакуты, разабраўся ў прычыне гэтых пакутаў і разумее свой лёс. А. Камю піша: «Я думаю, што ўсе добра», – кажа Эдзіп, і гэтыя словы святыя... Яны выганяюць з гэтага света Бога... Яны ператвараюць лёс у справу рук чалавека, справу, якая павінна рашацца сярод людзей» [2, с. 92].

Такім чынам, вобразам Сізіфа А. Камю даводзіць да чытачоў думку пра тое, што чалавек павінен адказваць за свой лёс сам, самастойна ім распараджацца. Чалавек павінен быць валадаром сваіх дзён, хоць нехта чужы, які стаіць вышэй (ці Бог, ці дзяржава), імкнецца вырашыць яго лёс. З тэорыі абсурду выцякае бунт – гэта «барацьба інтэлекта з рэальнасцю, якая яго пераважае» [2, с. 18]. Нездарма Хведар Роўба імкнецца зразумець прычыну сваіх пакут – тую невядомую моц, якая распараджаецца яго лёсам так бесцырымонна; Сізіф жа ўжо спасцігнуў яе, таму і шчаслівы. Што датычыць літаратурнага героя хайдэгераўскага «Праселка», то ім, на нашу думку, можа з'яўляцца кожны чалавек, які вяртаецца дадому з чужыны, якога вядзе праселкавы шлях да родных вытокаў. Менавіта ва ўсведамленні таго, што гэтая дарога – адзінае выйсце ў свеце і шчасце для ўсялякага чалавека, што ісціна – у вяртанні, у разуменні таго, што, каб быць шчаслівым, трэба вярнуцца, – і заключаецца чалавечае існаванне і лёсавырашэнне.

Такім чынам, літаратурны герой М. Хайдэггера павінен прыйсці да ўсведамлення сэнсу свайго існавання самастойна; герой В. Быкава Хведар Роўба імкнецца атрымаць адказ на свае рытарычнае пытанне, убачыць свайго лёсавырашальніка ў твары канкрэтных прадстаўнікоў улады начале з уласным сынам і ў выніку – вырашыць самастойна свой лёс; герой А. Камю Сізіф ужо ўсвядоміў свой лёс, і яго велічнасць заключаецца ў разуменні і атаясамліванні безнадзейнасці, бо ў моманце зыходжання ўніз з гары ен уздымаецца нават над сваім лёсам. У гэтым разуменні знікаюць ісціны, а з імі і багі. Сізіф ведае свой лёс і валодае ім. Узнікае пытанне: ці варта жыцце таго, каб жыць, ці яно таго не варта?

Для А. Камю гэта асноўнае філасофскае пытанне. І ён адказвае: «Чалавек – гэта істота, якая павінна свядома ўзяць на сябе адказнасць за свае брыдкае сэнсу існаванне і намаганнем свайго жыцця сама павінна даць яму сэнс» [1, с. 215]. Менавіта ў самастойнай адказнасці чалавека за сэнс свайго жыцця, за свой лёс, за яго вырашэнне заключаецца сапраўднае існаванне, якое даступна нямногім людзям. Аднак кожны чалавек з'яўляецца «кінутым» у свет, дзе ён не можа жыць без зносінаў з іншымі людзьмі. Грамадства падаецца экзістэнцыялістамі як усеагульная сіла, якая разбурае індывідуальнасць, адбірае ў чалавека яго быцце. Так, для М. Хайдэггера грамадства – гэта бязлікае «яно», якое навязвае асобе агульныя норавы і правілы, густы, погляды, перакананні. Згодна філасофіі экзістэнцыялізму, чалавек, які заразіўся страхам смерці, шукае прытулак у грамадстве. Пры гэтым ен уцягваецца ў несапраўднае існаванне. Такім чынам, чалавек растае ў бязлікім натоўпе, у «яно», а іншыя людзі забіраюць у яго быцце, ператвараючы яго самога ў нешта, пазбаўленае індывідуальнасці.

У «Міфе пра Сізіфа» ролю натоўпа выконваюць багі, што навязваюць сваю волю Сізіфу, які, аднак, вызваляецца ад іх улады. «Чорная сіла», натоўп у «Аблаве» – гэта сталінская ўлада, дзяржава – машына для татальнага генацыду свайго народа, «нязведаная» моц, якая можа вырашаць людскія лёсы, у выніку чаго душы і сэрцы людзей, што яшчэ змаглі ўцалець, застаюцца знявечанымі, «прычасанымі пад адзін грабянец».

Вось яна – сутнасць несапраўднага існавання, якая прымушае прыстасоўвацца, жыць не ў суладдзі з сабою, са сваім сумленнем. Палітыка дзяржавы, рэчаіснасць падштурхоўвае да таго, каб чалавек прыстасоўваўся да розных умоў існавання: і ў Сібіры, і на лесасеках, і ў холадзе, і ў голадзе. А Хведар Роўба жыў па законах сумлення, меў сям'ю, кавалак зямлі, нават купіў малатарню, адразу па савецкіх законах «запісаўшы» сябе ў шэрагі кулакоў.

Чаму тысячы такіх «хведараў роўбаў» апынуліся ў сталінскіх лагерах, і да чаго гэта прывяло – судзіць будзем не мы. Аддадзім гэтае права вышэйшаму суду і суду гісторыі. Нам важна ведаць, чаму свядомасць чалавека змянілася настолькі, што замест таго, каб думаць пра сям'ю, жыцце, быт, чалавек думае пра тое, як выжыць, ды задае сабе адзінае пытанне: «Божа літасцівы, чаму я такі нешчаслівы. Жывуць жа людзі, спакойна ходзяць па гэтай зямельцы... А я...» [4, с. 315]. А ён – чалавек на імшарыне.

З шэрагу несапраўднага і незямнога існавання вылучаецца экзістэнцыя, якая праяўляецца тады, калі чалавек трапляе ў памежную сітуацыю – вастрэйшы эмацыянальны стрэс, звязаны з перажываннем страху смерці і абсурднасці жыцця. У памежнай сітуацыі чалавек знаходзіцца ў стане маральнай, інтэлектуальнай ці фізічнай пагібелі. Менавіта ў такім стане да яго прыходзіць успрыманне і разуменне асабістага «я» ў ходзе датыкнення з вышэйшым відам быцця – трансцэндэнцыяй, якое з'яўляецца неспасцігальным і недаступным ва ўмовах звычайнага чалавечага жыцця.

В. Быкаў у аповесці «Аблава» вельмі яскрава і сімвалічна апісвае ўчынак вераб'я, пад лёсам якога падразумяваецца чалавечы лёс. Пісьменнік пераканаўча паказвае нам падабенства чалавечага і птушына-

га існавання: «...Ці не гэта такі спрадвечны закон прыроды – каб усе на аднаго? Але чаму на аднаго? Чым гэты верабей разгнявіў астатніх? Можа толькі якімсьці непадабенствам, ... ці можа быць так, што ен і не вінаваты – вінавата стая? Як у людзей?» [4, с. 342].

Такім чынам, Хведар Роўба, як і кожны чалавек, асуджаны на жыцце ў грамадстве; знаходзіцца сам-насам з сабой; думае пра канчатковасць свайго быцця ў свеце, а калі знаходзіцца ў грамадстве, сярод людзей, то імкнецца быць такім, як усе, душыць сваю сутнасць і адыходзіць ад сапраўднага існавання, вымушаны датыкацца да неаўтэнтычнага.

Хведар Роўба жыве ў пастаянных пакутах, адчаі. Паміраюць на Поўначы жонка і дачка, і ен вырашае зрабіць уцекі з лагера, што ўдаецца. Але да безвыходнасці і адчаю прымешваецца цяпер яшчэ і пачуцце страху – а раптам паймаюць? Толькі ноччу і бывае яму цяпер спакой; а калі ж узыдзе над зямлей поўня і асвеціць пяцікутную зорку – сімвал новай улады – тады ажываюць страхі і цені, абуджаюцца душэўныя пакуты і ўспаміны.

І чалавек вымушаны блукаць па імшары ды ратавацца ад «чумы», якая захіснула краіну, ператварыўшы яе ў багну, існаванне людзей – у ваўчыныя ўцекі, а сітуацыю ў краіне – у аблаву. Загнаны ў «дрыгву» чалавек – селянін Хведар Роўба – апынуўся ў стане безвыходнасці, у стане выбару ў памежнай сітуацыі: ці памерці, патануўшы ў бездані імшары, ці здацца ўладам, пазбавіўшыся і ўласнага сына-здрадніка, і ўласнай свабоды. У той момант, калі сын палкай пароў суседнюю купіну, каб дастаць свайго бацьку, Хведар выпусціў з рук раслінны корань – багна праглынула яго, багна, якая з'яўляецца сімвалам «вышэйшага» суда, што мае права кіраваць чалавечым лёсам. Але цікавіць нас іншае. Смерць Хведара Роўбы па сваей сутнасці – учынак абсурдны. Пад уплывам і ўціскам абставін, пад націскам усеагульнай моцы грамадства чалавек апынаецца ў стане выбару: добраахвотна прыняць смерць як палегку, бо падразумяваецца, што, перанесшы на зямлі столькі пакутаў, чалавек у «быцці», у «нічым» будзе шчаслівы, ці застацца ў свеце як арэне паўсядзеннага, несапраўднага існавання?

В. Быкаў прымушае чытача адначасова задумацца і над пытаннем мэтазгоднасці чалавечага самазабойства. Ва ўсе часы людзі забівалі сабе падобных у гадзіны войнаў і звадак. Але чаму чалавек вымушаны аплочваць памылкі іншых людзей такім высокім коштам? З другога боку, на наша меркаванне, Хведар Роўба сваей смерцю сцвярджае асабістую годнасць ды набывае ўласную свабоду і сапраўднае існаванне. Яго багна – яго жыцце.

І Сізіф А. Камю таксама з'яўляецца сцвярджальнікам пафасу свабоды і сапраўднага існавання, бо ў веры і ўсведамленні, у пазнанні безвыходнасці – яго жыцце. Яго скала – яго справа.

Цікавай і шматпланавай з'яўляецца сімволіка ў трох разглядаемых намі творах. Паводле слоў А. Камю: «...Сімвал прадугледжвае два планы – свет ідэй і свет уражанняў, і слоўнік суадносінаў паміж імі...» [2, с. 94].

В. Быкаў карыстаецца сімволікай гучных назваў: балота, куды сяляне ходзяць па ягады, завецца Багавінне, гэта значыць, багна, якая хавае ў сабе ўсе людскія таямніцы, гора, слезы ды пакуты; веска называецца Нядолішча – сялянскай долі, сапраўды, не пазайздросціш.

Яскрава можна прасачыць падабенства сімвалаў у творах В. Быкава «Аблава» і М. Хайдэгера «Праселак». На першы погляд, гэтыя творы даволі розныя. Але пры ўважлівым прачытанні можна знайсці ў іх шмат агульнага. Напрыклад, у абодвух творах прысутнічае сімвал дарогі, якая вядзе чалавека з далекага свету назад, да роднага парога.

У М. Хайдэгера паветра абапал дарогі насычана светлай радасцю. Дадзенае паветра нават змяняецца ў адпаведнасці з порамі года, і чалавек павінен адчуваць гэтую тонкую струнку, гэтую змену, гэтую радасць набліжэння да свайго дому, да роднага, кроўнага, да вытокаў. У В. Быкава галоўны герой вяртаецца дадому з далекай Поўначы, несучы ў сабе пачуцце радасці ад сустрэчы з роднай зямлей, са сваей яблыняй на мяжы. І ў тым, і ў другім выпадку чалавек не можа не адчуваць гэтай радасці вяртання, гэтага клічу дарогі дадому. Калі чалавек не падначаліўся гармоніі гэтага клічу, то ен не зможа навесці парадак ні ў свеце, ні ў сваім сэрцы. У наш час чалавек пакрысе пазбаўляецца шляхоў-дарог, што вядуць да бацькоўскага парога, цураецца сваіх каранеў, як адцураўся іх сын Хведара Роўбы – Мікола, што прадаў бацьку за гучныя лозунгі і пустую браваду. Заўседы ў свеце адной з найбольшых каштоўнасцяў лічылася прастата. Герой В. Быкава – чалавек просты, ен стаіць ля вытокаў усяго народнага, вясковага, сялянскага. Хведар вяртаецца са сталінскага прыгону на родную зямлю, імкнучыся да яе ўсей сваей душой, трываючы шматлікія пакуты і гора, але ўпарта рухаючыся наперад, да каранеў. Яго саграваe дарога дадому. У «Праселку» М. Хайдэгера чытаем: «Дарога светлай ніткай бяжыць міма пакрытых свежай зелянінай ніў і абуджаных лугоў» [3, с. 4]. Сапраўды, дарога назад, вяртанне дадому заўседы суправаджаецца толькі светлымі пачуццямі і невыказнай чысцінёй. Амаль заўседы ля дома ці абапал дарогі да яго павінны расці пэўнае дрэва ці шэраг дрэў – сімвалы дамашняй утульнасці, сямейнага ачага. У М. Хайдэгера гэта дуб, у В. Быкава – яблыня. З дадзенымі дрэвамі звязаны дзяцінства, юнацтва і сталасць чалавека, да іх ідуць каяцца і ўспамінаць былое. Калі дрэвы трапляюць пад лязо сякеры, то ім адсякаюць карані, значыць, вынішчаюць мінулае, спадчыну. А калі не маеш мінулага, не захоўваеш яго, то пазбаўляешся і будучыні.

Тэма вяртання ў абодвух творах – гэта вяртанне не толькі дадому, але і да сябе самога. Гвалтам ці добраахвотна адарваны ад роднай зямлі чалавек, вяртаючыся да вытокаў, павінен адчуваць гармонію ў душы і сэрцы. Гукі колакала ў М. Хайдэггера – гэта рэквіем ахвярам двух сусветных войнаў. А гукі, што парушылі цішыню векавога лесу ў аповесці «Аблава», гучаць як набат: дзеці, спыніцеся, што вы робіце? Няўжо вас не супыняць парывы сумлення і вы пойдзеце супраць сваіх бацькоў? У М. Хайдэгера знаходзім: «За апошнім ударам колакала яшчэ цішэй цішыня... Ці гэта гаворыць душа? Ці свет? Ці Бог? Пранікнены кліч пасяляе ў доўгім ланцузе вытока» [3, с. 7].

Цішыня – гэта апошняя кропка, якую можна паставіць ва ўсіх трох разглядаемых творах: напружаная цішыня ў «Аблаве» В. Быкава, спакойная цішыня ў «Міфе пра Сізіфа» А. Камю, пранікненая цішыня ў «Праселку» М. Хайдэггера.

Такім чынам, на прыкладзе дадзеных літаратурных твораў XX стагоддзя яскрава прасочваюцца асноўныя палажэнні філасофіі экзістэнцыялізму, якая прымусіла людзей задумацца над пытаннямі вывучэння чалавека, яго месца ў свеце, індывідуальнага існавання і сэнсу жыцця. Можна з упэўненасцю сказаць, што філасофія экзістэнцыялізму з'яўляецца гуманістычнай крытыкай шматлікіх «язваў» XX стагоддзя: сусветных войнаў, масавага знішчэння людзей, зневажання чалавечай годнасці, рэпрэсійнага ўплыву грамадства на чалавечую асобу. Яна абараніла імкненне людзей да творчасці і унікальнасці, арыгінальнасці і непаўторнасці, увайшоўшы сваімі ідэямі ў свядомасць сучаснага грамадства.

## ЛІТАРАТУРА

1. Хюбшер А. Мыслители нашего времени. Справочник по философии Запада XX века. – М., 1994.
2. Камю А. Бунтующий человек. – М., 1990.
3. Михайлов А.В. Миртин Хайдеггер: человек в мире. – М., 1990.
4. Быкаў В. У тумане. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1989.